

КІНО, ЯКОЕ ВЫКЛІКАЕ СПРЭЧКІ

5

ДАБРО ВЯРТАЕЦЦА...

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на родней мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

22 ЛІПЕНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 142 (29764)

## КОРАТКА

• «Белэнерга»: планавага адключэння электрасетак у ацяпляльны сезон не будзе.

• **«Аэрафлот» з 22 ліпеня ўвёў яшчэ адзін рэйс з Масквы ў Мінск.**

• Экспарт беларускіх тавараў у Кітай за пяць месяцаў узрос у 1,5 раза.

• **У Беларусі на паўгода ўвялі ліцэнзаванне экспарту льновалакна.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Па выніках работы за I квартал 2022 года кошт квадратнага метра з дзяржпадтрымкай сфарміраваўся ў памеры Br1176. Гэты кошт суадносіцца з сярэдняй заработнай платай па краіне. Цяпер іх суадносіны 0,76. У будаўніцтве жылля ёсць і спадарожныя выдаткі: праектаванне, работы па жаданні заказчыка, тэхнагляд. Сёння асноўная ўвага аддадзена якраз гэтым спадарожным выдаткам. Мы іх вельмі старанна аналізуем. Думаю, што за кошт гэтага і будзем імкнуцца да яшчэ большага скарачэння кошту будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай. Адзначу, што цана на жыллё будзе скарэкціравана прыкладна на 3-5 % у бок патанення. Гэта таксама будзе распаўсюджвацца на кошт камерцыйнага жылля. Заказчыкі дзейнічаюць па адных правілах і пры будаўніцтве жылля з дзяржпадтрымкай, і на камерцыйным жыллі».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Я АБГРУНТОЎВАЮ ГЭТА ТЫМ, КАБ ЗАЎТРА БЫЛО ЛЮДЗЯМ ЛЕПШ»

### Беларускі лідар аб дыктатуры, панславянскім свеце і сітуацыі на планеце

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Франс Прэс». З кіраўніком дзяржавы размаўляў намеснік дырэктара і галоўны рэдактар бюро інфармацыйнага агенцтва «Франс Прэс» у Маскве Антуан Ламбраскіні. Беларускі лідар адказаў на многія актуальныя пытанні журналіста. Падчас інтэрв'ю, якое працягвалася больш за гадзіну, бакі закранулі такія тэмы, як унутрыпалітычная сітуацыя ў Беларусі, адносіны Беларусі і Расіі. Зноў былі ўзняты сітуацыя вакол самалёта Ryanair і расследаванне ІКАО. Аляксандр Лукашэнка падзяліўся сваімі поглядамі на дыктатуру і санкцыі Захаду. Кіраўнік дзяржавы расказаў, калі скончыцца канфлікт ва Украіне і якая роля Беларусі ў расійскай спецаперацыі.**



Фота БелТА.

#### «ВОСЬ ТАДЫ БУДЗЕ ДЫКТАТУРА»

Журналіст закрануў тэму дыктатуры ў Беларусі, свaім бачаннем на якую падзяліўся Аляксандр Лукашэнка. «Цяпер усе кажуць пра голад. І я згодны, што мы вельмі блізка ад гэтага бар'ера. Голад проста стукаецца. Многія галадаюць ужо. Можна было б сказаць: «Не крытычна». Але як «не крытычна», калі кожныя 10 секундаў памірае дзіця ў свеце? Не голад? Голад. І я вельмі жорстка цяпер стаўлю пытанне (гэта датычыцца сялян, ды і ўсёй краіны) па ўборцы ўраджаю. Трэба сабраць усё. Трэба мабілізавацца. Бо, крый божа, голад — вось тады будзе дыктатура. І ў Францыі ў тым ліку. Трэба народ выратаваць. Не накарміць, а выратаваць, каб людзі не памерлі», — сказаў беларускі лідар. Ён адзначыў, што такія жорсткія патрабаванні кіраўніка дзяржавы могуць быць расцэнены як дыктатура, але ў падобным выпадку гэта апраўдана важнай мэтай — палепшыць жыццё людзей, не дапусціць крытычных сітуацый.

«Калі ласка, можаце мяне за гэта крытыкаваць. Але я гэта абгрунтоўваю тым, каб заўтра было людзям лепш. А не тое, што мне вось хочацца дыктаваць і я з глузду з'ехаў, седзячы ў цэнтры Еўропы, у адносна невялікай краіне, з невялікім насельніцтвам, я чагосьці пачынаю дыктаваць і яшчэ душыць уласны народ, які прагаласаваў за мяне даўным-даўно і падтрымлівае мяне да гэтага часу», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Прыёмная кампанія — 2022

# «Момант ісціны» для абітурыентаў

### Найлепшыя веды на ЦТ дэманструюць выпускнікі гімназій і ліцэяў

**Абсалютны вынік — 100 балаў — паказалі сёлета 337 удзельнікаў ЦТ па 12 вучэбных прадметах. 314 чалавек атрымалі адзін стабальны сертыфікат. Двойчы па сто балаў здолелі набраць 22 абітурыенты (у 2021 годзе такіх было 25, у 2020-м — 15 чалавек). А ў абітурыенткі Настассі Більдзь проста фенаменальны вынік — тры стабальныя сертыфікаты: па беларускай мове, матэматыцы і фізіцы. Сярэднюю школу № 8 Ліды дзяўчына скончыла з сярэднім балам атэстата «10». Такім чынам у яе на руках была максімальна магчымая сума балаў (400), якая дазваляла ёй паступіць у любую ВНУ краіны. Настасся ўжо вызначылася з выбарам і падала свае дакументы ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі на спецыяльнасць «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання».**

#### У роўных умовах

Як расказала журналістам **начальнік упраўлення па распрацоўцы і сертыфікацыі тэстаў Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Таццяна УЛАСЕНКА** для ўдзелу ў ЦТ сёлета зарэгістраваліся 61786 абітурыентаў, з іх 1,5 тысячы на ўступныя іспыты не з'явіліся. Практычна кожны трэці абітурыент рэгістраваўся на чатыры вучэбныя дысцыпліны. Таксама для ўдзелу ў беларускім ЦТ сёлета зарэгістраваліся 191 грамадзянін Расійскай Федэрацыі і 14 грамадзян Рэспублікі Казахстан.

За розныя парушэнні парадку правядзення ЦТ былі выдалены дзевяць чалавек. Не прайшлі тэсціраванне з-за медыцынскіх паказанняў — 18. Ім далі магчымасць узяць удзел у ЦТ у рэзервовыя дні.

Самы высокі вынік цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні — 98 балаў (па беларускай мове). Ёсць таксама два вынікі па 97 балаў. Адзін абітурыент здаў паспяхова матэматыку, а другі — англійскую мову.

Самымі запатрабаванымі прадметамі на ЦТ у 2021 годзе былі руская мова (на яе зарэгістраваліся 50 389 абітурыентаў) і матэматыка (33 835 чалавек). А сярод замежных моў лідзіравала англійская (24 180 абітурыентаў).

СТАР. 3

Ігар ШУНЕВІЧ:

# «ТАВАРЫСТВА ПАДОБНАЕ НА КАРАБЕЛЬ. КРУТА ПАВАРОЧВАЦЬ ЯГО НЕ ЗБІРАЮСЯ»



**Ігара Шуневіча ўсе ведаюць як міністра ўнутраных спраў з 2012 да 2019 года. З восені мінулага года генерал-лейтэнант міліцыі запасу ўзначальвае Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў, і гэта таксама не засталося незаўважаным. Пра таварыства адразу ж загаварылі ў СМІ. Новую эпоху жыцця грамадскай арганізацыі пазначыла нядаўняе наваселле цэнтральнага апарату. Сам старшыня звярнуўся з шэрагам прапаноў да ўрада, далажыў аб стане спраў кіраўніку дзяржавы, у ліпені ўступаюць у сілу пэўныя заканадаўчыя змяненні ў дадзенай сферы. І, падобна, гэта толькі пачатак. «Звязда» распытала кіраўніка БТПР пра яго ідэі і бачанне развіцця паляўніцтва і рыбалоўства ў Беларусі.**

СТАР. 4